Зарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
25 лістапада 1991 г.

Зацверджаны
з'ездам НПГБ
6 лістапада 1991 г.

Перарэгістраваны 27 чэрвеня 1995 г.,
24 красавіка 1999 г.

Змяненні і дапаўненні ў статут
унесены 29-30 чэрвеня 1995 г.,
4 лютага 1999 г.

Змяненні і дапаўненні,
унесеныя ў статут,зарэгістраваны
8 верасня 2003 г., 21 мая 2004 г.,
19 сакавіка 2012 г.

Змяненні і дапаўненні ў статут
унесены Радай прадстаўнікоў
11 жніўня 2003 г., 11 сакавіка 2004 г.
20 лютага 2012 г.

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь
ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ
змяненняў ~~(альбо) дапаўненняў~~, унесеных у статут,
здзейснена
Рашэннем ад 31. 03. 2015 № 59
У Адзіным дзяржаўным рэгістры
юрыдычных асоб і індывідуальных
прадпрымальнікаў № 600353358
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 084
Подпіс
М.П.

Змяненне ў статут
унесена Радай прадстаўнікоў
20 лютага 2015 г.

# СТАТУТ

## БЕЛАРУСКАГА НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА

## ГАРНЯКОЎ, ХІМІКАЎ, НАФТАПЕРАПРАЦОЎШЧЫКАЎ,

## ЭНЕРГЕТЫКАЎ, ТРАНСПАРТНІКАЎ, БУДАЎНІКОЎ

## І ІНШЫХ РАБОТНІКАЎ

г. Салігорск
2015 год

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1.Беларускі Незалежны прафсаюз гарнякоў, хімікаў, нафтаперапрацоўшчыкаў, энергетыкаў, транспартнікаў, будаўнікоў і іншых работнікаў (далей Незалежны прафсаюз) - прафесійны саюз работнікаў прадпрыемстваў, установ і арганізацый вытворчай і невытворчай сфер дзейнасці незалежна ад форм уласнасці, звязаных агульнымі інтарэсамі па роду іх дзейнасці, аб'яднаўшыхся на добраахвотных і раўнапраўных асновах для абароны сваіх прафесійных, грамадзянскіх, маёмасных і іншых правоў і законных інтарэсаў, прыцягнення працоўных да вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем і паляпшэння іх становішча ў грамадстве на аснове сацыяльнай справядлівасці і гуманізму.

1.2. Незалежны прафсаюз з'яўляецца правапераемнікам Незалежнага прафсаюза гарнякоў Беларусі (НПГБ) і ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь 1994 года (са зьяненнямі і дапаўненнямі), прынятай на рэспубліканскім рэферэндуме 24.11.1996 года, іншымі актамі дзеючага заканадаўства, гэтым Статутам, Усеагульнай Дэкларацыяй правоў чалавека, Канвенцыямі Міжнароднай Арганізацыі Працы і іншымі ратыфікаванымі Рэспублікай Беларусь ва ўстаноўленым парадку міжнароднымі нарматыўнымі актамі.

1.3. Незалежны прафсаюз з'яўляецца самастойным аб'яднаннем грамадзян. У сваёй дзейнасці ён незалежны ад органаў дзяржаўнай улады і кіраўніцтва, палітычных і іншых грамадскіх арганізацый.

1.4. Незалежны прафсаюз усталёўвае па свайму выбару сувязі і кантакты з грамадскімі аб'яднаннямі грамадзян Рэспублікі Беларусь і іншых краін.

1.5. Дзейнасць Незалежнага прафсаюза распаўсюджваецца на ўсю тэрыторыю Беларусі.

1.6. Незалежны прафсаюз з'яўляецца юрыдычнай асобай.

Яго мясцовыя структуры (пярвічныя і рэгіянальныя арганізацыі) надзяляюцца правамі юрыдычнай асобы рашэннем Рады прадстаўнікоў.

1.7. Паведамленні аб рэгістрацыі, перарэгістрацыі ці ліквідацыі змяшчаюцца ў сродках масавай інфармацыі (газета «Рэспубліка» і інш.)

1.8. Юрыдычны адрас Незалежнага прафсаюза: 223710, Мінская вобласць, г. Салігорск, вул. Багамолава, 13А-5.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ

2.1. Мэтай Незалежнага прафсаюза з'яўляецца павышэнне жыццёвага ўзроўню і сацыяльнай абароненасці яго членаў, абарона іх працоўных, сацыяльна-эканамічных, грамадзянскіх, маёмасных і іншых правоў і законных інтарэсаў.

2.2. Задачы Незалежнага прафсаюза:

- прадстаўляць і адстойваць інтарэсы членаў прафсаюза ў органах дзяржаўнай улады і кіраўніцтва, а таксама органах самакіравання прадпрыемстваў;

- заключаць пагадненні і калектыўныя дагаворы па пытаннях паляпшэння ўмоў жыцця і працы членаў Незалежнага прафсаюза і іх сем'яў, вырашэння праблем аплаты працы, занятасці, рабочага часу, адпачынку і сацыяльнага забеспячэння;

- ажыццяўляць нагляд і кантроль за выкананнем заканадаўства аб працы ў адносінах да членаў Незалежнага прафсаюза і ўдзельнічаць у яго ўдасканальванні;

- дабівацца прывядзення законаў Беларусі ў адпаведнасць з міжнароднымі нормамі права;

- дабівацца бяспечных і здаровых умоў працы на вытворчасці, удзельнічаць у распрацоўцы правілаў і норм аховы працы;

- арганізоўваць прафесійную падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі, сацыяльна-эканамічных і прававых ведаў;

- арганізоўваць работу з моладдзю;

- арганізоўваць адпачынак і вольны час членаў Незалежнага прафсаюза і іх сем'яў;

- дабівацца дадатковых відаў сацыяльнага страхавання і прымянення індывідуальных рахункаў;

- ствараць страхавыя, крэдытныя і іншыя фонды мэтавага і спецыяльнага прызначэння;

- спрыяць эфектыўнаму вырашэнню працоўных спрэчак і канфліктаў.

2.3. Для вырашэння агульных праблем і адстойвання іх перад структурамі ўлады ўсіх ўзроўняў Незалежны прафсаюз можа аб'ядноўвацца з іншымі прафесійнымі саюзамі і грамадскімі аб'яднаннямі грамадзян.

## 3. МЕТАДЫ ДЗЕЙНАСЦІ

3.1. Для вырашэння мэтаў і задач Незалежны прафсаюз:

- ажыццяўляе грамадскі кантроль адпаведнасці тэхналогій, арганізацыі і ўмоў працы, дзе працуюць яго сябры, дакументам, якія рэгламентуюць дзейнасць прадпрыемстваў;

- акумуліруе станоўчы айчынны і міжнародны вопыт перадавых метадаў арганізацыі працы і прыёмаў работы на прадпрыемствах галін прамысловасці, дзе дзейнічаюць арганізацыі Незалежнага прафсаюза, шырока яго прапагандуе і дабіваецца ўкаранення ў вытворчасць;

- удзельнічае ў рабоце камісій па расследаванню няшчасных выпадкаў у адносінах членаў Незалежнага прафсаюза і афармленню адпаведных дакументаў;

- праводзіць анкетаванне і тэсціраванне членаў Незалежнага прафсаюза па пытаннях умоў працы і адпачынку;

- садзейнічае сацыяльна-эканамічнай і псіхалагічнай адаптацыі членаў Незалежнага прафсаюза ва ўмовах змянення форм уласнасці і пераходу да рынку;

- дабіваецца прымальных і задавальняючых членаў Незалежнага прафсаюза ўмоў прыватызацыі;

- дзеля здзяйснення статутных мэтаў і задач стварае прадпрыемствы і іншыя гаспадарча-разліковыя арганізацыі, якія маюць правы юрыдычнай асобы і ажыццяўляюць гаспадарчую дзейнасць, у тым ліку знешнеэканамічную;

- засноўвае сродкі масавай інфармацыі і ажыццяўляе выдавецкую дзейнасць;

- ажыццяўляе іншую дзейнасць, не забароненую дзеючым заканадаўствам.

## 4. СТРУКТУРА І ОРГАНЫ НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА

4.1. Аснову Незалежнага прафсаюза складаюць пярвічныя арганізацыі, ствараемыя па вытворчаму або прафесійнаму прынцыпу, пры наяўнасці 10 і болей членаў Незалежнага прафсаюза па месцы працы або вучобы.

Прадпрымальнікі без права набыцця статуса юрыдычнай асобы могуць стварацць свае арганізацыі па месцы іх дзейнасці.

Пярвічныя арганізацыі могуць быць створаны грамадзянамі, якія працуюць на адным прадпрыемстве, у адной арганізацыі, установе ці навучаюцца ў адной навучальнай установе, шляхам самаарганізацыі.

Членства ў Незалежным прафсаюзе ў гэтым выпадку пачынаецца з моманту правядзення сходу аб стварэнні пярвічнай арганізацыі.

4.2. Пярвічныя арганізацыі могуць ствараць у сваім складзе прафсаюзныя арганізацыі па структурных падраздзяленнях (цэх, участак і інш.).

Вышэйшым органам пярвічнай арганізацыі з'яўляецца сход (канферэнцыя), склікаемы па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў год. Правамоцны пры наяўнасці больш палавіны яго членаў (дэлегатаў). Рашэнне прымаецца  простай большасцю галасоў. Яны вызначаюць форму, метады работы і структуру выбарных органаў пярвічных арганізацый.

4.3. Пярвічныя арганізацыі праходзяць рэгістрацыю ў кіруючым органе рэгіянальнай арганізацыі. Калі такі орган  у горадзе, раёне, вобласці адсутнічае, рэгістрацыя праводзіцца ў Выканаўчым бюро Незалежнага прафсаюза.

4.4. Пярвічныя арганізацыі могуць аб'ядноўвацца ў рэгіянальную (абласную, раённую, гарадскую) арганізацыю Незалежнага прафсаюза. Рэгіянальныя арганізацыі роўныя паміж сабой.

4.5. Вышэйшым органам рэгіянальнай арганізацыі Незалежнага прафсаюза з'яўляецца канферэнцыя, склікаемая па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў год. Правамоцна пры наяўнасці больш палавіны яго членаў (дэлегатаў). Рашенне прымаецца простай большасцю галасоў. Яна вызначае форму, метады работы і структуру выбарных органаў. Для вырашэння

асобных пытанняў пастановай адпаведнага выбарнага органа Незалежнага прафсаюза можа праводзіцца рэферэндум.

4.6. Абавязкамі любога выбарнага кіруючага органа Незалежнага прафсаюза з'яўляюцца:

- прыцягненне новых членаў;

- правядзенне сходаў (канферэнцый), прадстаўленне на іх абмеркаванне справаздачнага даклада аб сваёй дзейнасці і стане сродкаў і маёмасці;

- інфармаванне членаў аб рашэннях вышэйстаячых органаў, палітыцы прафсаюза, дастаўка членам Незалежнага прафсаюза друкаваных выданняў і распаўсюджванне інфармацыі аб яго дзейнасці.

4.7. Пярвічная арганізацыя Незалежнага прафсаюза заключае калектыўны дагавор ці пагадненне з адміністрацыяй, уласнікам або упаўнаважаным ім органам.

Для вядзення перагавораў, заключэння калектыўнага дагавору (пагаднення), а таксама кантролю за іх выкананнем арганізацыйныя структуры могуць ускладаць гэтыя абавязкі на абраных упаўнаважаных прадстаўнікоў, правы і абавязкі якіх замацоўваюцца ў заключаемым дакуменце.

4.8. Рэгіянальныя і пярвічныя арганізацыі, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым гэтым Статутам парадку, якія рэгулярна пералічваюць на рахунак Незалежнага прафсаюза прадугледжаную гэтым Статутам частку членскіх узносаў, дэлегуюць у Савет прадстаўнікоў свайго ўпаўнаважанага прадстаўніка.

Арганізацыя, якая не выканала адно з пералічаных патрабаванняў, мае права дэлегаваць у Раду прадстаўнікоў свайго прадстаўніка з правам дарадчага голасу.

4.9. Рэгіянальная арганізацыя Незалежнага прафсаюза заключае мясцовае Тарыфнае пагадненне з органамі выканаўчай улады і аб'яднаннем наймальнікаў.

4.10. Мясцовыя арганізацыі (пярвічныя і рэгіянальныя) зацвярджаюць свой каштарыс выдаткаў з улікам адлічэнняў на рахунак Незалежнага прафсаюза не меней 25% сумы членскіх узносаў. Па рашэнню Рады прадстаўнікоў на рэалізацыю рэспубліканскіх мэтавых праграм мясцовыя арганізацыі абавязаны адлічваць дадатковыя сродкі прапарцыянальна колькасці сваіх членаў.

4.11. Рашэнне вышэйшага і кіруючага органа мясцовай арганізацыі не можа быць адменена вышэйстаячымі органамі Незалежнага прафсаюза, калі яно не супярэчыць гэтаму Статуту.

4.12. Вышэйшым органам Незалежнага прафсаюза з'яўляецца з'езд, які праводзіцца адзін раз у чатыры гады.

Пазачарговы з'езд склікаецца па рашэнню Рады прадстаўнікоў або па ініцыятыве Кантрольна-рэвізійнай камісіі ці па патрабаванню не меней 1/3 членаў Незалежнага прафсаюза.

Аб даце, месцы правядзення, парадку дня з'езда і норме прадстаўніцтва рашэнне прымае Рада прадстаўнікоў, не менш чым за месяц да даты правядзення з'езда апавяшчае кіруючыя органы пярвічных і рэгіянальных арганізацый Незалежнага прафсаюза.

Члены Рады прадстаўнікоў і Кантрольна-рэвізійнай камісіі з'яўляюцца дэлегатамі з'езда.

З'езд правамоцны пры ўдзеле ў яго рабоце не меней дзвюх трэціх ад колькасці абраных дэлегатаў. Рашэнне прымаецца простай большасцю галасоў, за выключэннем выпадкаў, абумоўленых гэтым Статутам.

## 4.13. З ' Е З Д:

- вызначае праграмныя напрамкі дзейнасці Незалежнага прафсаюза;
- зацвярджае Статут Незалежнага прафсаюза, уносіць у яго дапаўненні і змяненні;
- абірае старшыню Незалежнага прафсаюза, віцэ-старшынь Незалежнага прафсаюза, сакратара-скарбніка і Кантрольна-рэвізійную камісію (КРК);
- заслухоўвае і зацвярджае справаздачы Выканаўчага бюро і Кантрольна-рэвізійнай камісіі;
- разглядае і прымае рашэнні па ўсіх асноўных пытаннях дзейнасці Незалежнага прафсаюза.

## 4.14. РАДА ПРАДСТАЎНІКОЎ:

Рада прадстаўнікоў - вышэйшы кіруючы орган Незалежнага прафсаюза, які дзейнічае паміж з'ездамі. Рада прадстаўнікоў фарміруецца са старшынь ці паўнамоцных прадстаўнікоў гэтых арганізацый.

Старшыня Незалежнага прафсаюза, віцэ-старшыні і сакратар-скарбнік Незалежнага прафсаюза ўваходзяць у Раду прадстаўнікоў па пасадзе.

Пасяджэнні Рады прадстаўнікоў праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго раза ў квартал. Пасяджэнні правамоцныя, калі на іх прысутнічае не меней 1/2 яго членаў.

Рашэнні Рады прадстаўнікоў прымаюцца простай большасцю.

Рада прадстаўнікоў:

- рэалізуе рашэнні з'езда Незалежнага прафсаюза;
- прымае заявы і дэкларацыі ад імя Незалежнага прафсаюза;
- прымае рашэнні аб уваходжанні ў іншыя аб'яднанні;
- уносіць прапановы ў адпаведныя органы дзяржаўнай улады і кіравання па абароне правоў і законных інтарэсаў членаў Незалежнага прафсаюза;
- выстаўляе патрабаванні аб адмене, прыпыненні дзеянняў ці ўнясенні змяненняў у рашэнні Выканаўчага бюро пярвічнай і рэгіянальнай арганізацый, якія парушаюць правы і законныя інтарэсы членаў Незалежнага прафсаюза;

- аб'яўляе ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам акцыі пратэсту па абароне правоў і законных інтарэсаў членаў Незалежнага прафсаюза;

- зацвярджае рашэнні Выканаўчага бюро аб рэгістрацыі пярвічных і рэгіянальных арганізацый і надзяленні іх правам юрыдычнай асобы;

- зацвярджае рашэнні Выканаўчага бюро аб ануляванні рэгістрацыі і пазбаўленні права юрыдычнай асобы рэгіянальных і пярвічных арганізацый за невыкананне палажэнняў гэтага Статута ці па іншых прычынах;

- адхіляе старшыню НП ад выканання сваіх абавязкаў у выпадку грубага парушэння ім Статута;

- уносіць змяненні і дапаўненні ў Статут, звязаные са змяненнямі ў заканадаўстве.

- дае каментарый асобных палажэнняў Статута Незалежнага прафсаюза і іншых унутрыпрафсаюзных дакументаў;

- пераабірае віцэ-старшынь і сакратара-скарбніка ў выпадку парушэння імі Статута і іншых унутрыпрафсаюзных дакументаў;

- зацвярджае і фарміруе фонды мэтавага і спецыяльнага прызначэння;

- у парадку, вызначаемым заканадаўствам, ажыццяўляе вытворча-гаспадарчую дзейнасць, стварае прадпрыемствы і іншыя гаспадарча-разліковыя арганізацыі, зацвярджае іх статуты (палажэнні);

- зацвярджае кіраўніцтва сродкамі масавай інфармацыі, друкаваных органаў, прадпрыемстваў і іншых гаспадарча-разліковых структур, ствараемых Незалежным прафсаюзам;

- зацвярджае ўзоры пячатак, штампаў і іншай атрыбутыкі Незалежнага прафсаюза;

- фарміруе грамадскія органы па напрамках дзейнасці Незалежнага прафсаюза;

- зацвярджае праграмы работы з моладдзю і жанчынамі;

- можа дэлегаваць частку сваіх паўнамоцтваў Выканаўчаму бюро;

- разглядае іншыя пытанні статутнай дзейнасці Незалежнага прафсаюза ў межах сваёй кампетэнцыі.

## 4.15. ВЫКАНАЎЧАЕ БЮРО

Выканаўчае бюро - рабочы орган Рады прадстаўнікоў Незалежнага прафсаюза. Ён складаецца са старшыні Незалежнага прафсаюза, віцэ-старшынь Незалежнага прафсаюза, сакратара-скарбніка Незалежнага прафсаюза.

Выканаўчае бюро:

- арганізуе выкананне рашэнняў з'езда і Рады прадстаўнікоў;

- фарміруе склад грамадскіх органаў, бюджэт і каштарыс выдаткаў і прадстаўляе на зацвярджэнне Рады прадстаўнікоў;

- каардынуе дзейнасць пярвічных і рэгіянальных арганізацый па вырашэнню статутных задач;

- арганізуе вывучэнне ўзроўню жыцця членаў Незалежнага прафсаюза;

- арганізуе сувязі і кантакты з іншымі грамадскімі аб'яднаннямі і рухамі;

- аказвае метадычную, арганізацыйную, кансультатыўную і іншую дапамогу пярвічным і рэгіянальным арганізацыям;

- арганізуе навучанне прафактыву Незалежнага прафсаюза, праводзіць іншыя мерапрыемствы;

- не пазней чым за два тыдні апавяшчае пярвічныя і рэгіянальныя арганізацыі аб скліканні чарговай Рады прадстаўнікоў, месцы яго правядзення і парадку дня;

- ажыццяўляе іншыя функцыі па арганізацыі дзейнасці Незалежнага прафсаюза.

Пасяджэнне Выканаўчага бюро праводзіцца не радзей аднаго раза ў месяц. Рашэнне прымаецца большасцю галасоў.

4.16. Усе рашэнні калегіяльных органаў афармляюцца пратаколамі.

## 4.17. СТАРШЫНЯ НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА

Старшыня Незалежнага прафсаюза валодае ўсімі правамі і паўнамоцтвамі кіраўніка, юрыдычнай асобы, у тым ліку:

- ад імя Незалежнага прафсаюза з'яўляецца прадстаўніком у органах улады і кіраўніцтва, міжнародных і ўнутрыдзяржаўных арганізацыях і прафрухах;

- ад імя Незалежнага прафсаюза заключае ўсе віды дагавораў і пагадненняў з грамадзянамі, прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі;

- акрэслівае абавязкі і функцыі віцэ-старшынь і сакратара-скарбніка, які арганізуе і забяспечвае справаводства, фінансавую, маёмасна-гаспадарчую дзейнасць Незалежнага прафсаюза, устанаўлівае адзіную для Незалежнага прафсаюза сістэму справаводства і справаздач, ажыццяўляе кантроль за яе выкананнем;

- ажыццяўляе іншую дзейнасць у адпаведнасці і згодна з патрабаваннямі гэтага Статута.

Старшыня Незалежнага прафсаюза абіраецца тэрмінам на 4 гады, ён можа быць датэрмінова вызвалены па ўласнаму жаданню або па рашэнню з'езда. Рашэнне прымаецца простай большасцю галасоў.

4.18. Кола абавязкаў віцэ-старшынь акрэсліваецца старшынёй Незалежнага прафсаюза.

Пры кароткатэрміновай адсутнасці старшыні адзін з віцэ-старшынь па пісьмоваму ці вуснаму распараджэнню старшыні выконвае яго абавязкі.

4.19. Пры фізічнай немагчымасці старшыні выконваць свае абавязкі выконваючага абавязкі старшыні вызначае Рада прадстаўнікоў.

## 5. ЧЛЕНЫ ПРАФСАЮЗА.
## IX ПРАВЫ і АБАВЯЗКІ

5.1. Членамі Незалежнага прафсаюза могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, дасягнуўшыя пятнаццацігадовага ўзросту і працуючыя ў горнай, хімічнай, нафтаперапрацоўчай, энергетычнай, транспартнай, будаўнічай і іншых галінах, навучэнцы і студэнты, звязаныя агульнымі інтарэсамі па роду іх дзейнасці.

5.2. Наймальнікі і іншыя асобы, надзеленыя правам прыёму і звальнення, якія ажыццяўляюць функцыі найму і звальнення, не могуць быць членамі Незалежнага прафсаюза.

5.3. Інжынерна-тэхнічныя работнікі, спецыялісты, служачыя і іншыя работнікі, на якіх не распаўсюджваецца пункт 5.2., могуць ствараць пярвічныя арганізацыі Незалежнага прафсаюза.

5.4. Пенсіянеры, хатнія гаспадыні, інваліды працы і беспрацоўныя, пакінуўшыя работу па ўважлівых прычынах, знаходзяцца на ўліку ў сваіх пярвічных арганізацыях.

5.5. Грамадзяне, якія належаць па роду дзейнасці да катэгорый, пералічаных у пункце 5.4., жадаючыя ўступіць ў Незалежны прафсаюз, падаюць заявы ў пярвічную арганізацыю па апошняму месцу працы.

5.6. Прыём у члены Незалежнага прафсаюза ажыццяўляецца ў індывідуальным парадку на аснове асабістай заявы ў Выканаўчае бюро пярвічнай арганізацыі. Членства ў Незалежным прафсаюзе адлічваецца з дня падачы заявы.

Членства ў іншым прафсаюзе не з'яўляецца перашкодай для прыёму ў Незалежны прафсаюз, калі прафсаюз мае падобныя мэты і задачы.

Асобы, выключаныя з Незалежнага прафсаюза за парушэнне палажэнняў гэтага Статута, не могуць быць прыняты паўторна.

5.7. Страта членства ў прафсаюзе наступае:

- па ўласнаму жаданню на падставе асабістай заявы;
- па рашэнню выбарчага органа за няўплату членскіх узносаў на працягу больш трох месяцаў і без уважлівых прычын, за нанясенне шкоды прафсаюзу сваімі дзеяннямі і парушэнне Статуту прафсаюза;
- па рашэнню сходу, канферэнцыі, з'езда для кіраўнікоў прафсаюзных органаў адпаведнага ўзроўню па прапанове пярвічнай арганізацыі.

5.8. Пры адсутнасці на прадпрыемстве, у арганізацыі, установе пярвічнай арганізацыі грамадзяне падаюць заяву аб прыёме ў прафсаюз у Выканаўчае бюро Незалежнага прафсаюза або рэгіянальнай арганізацыі.

### 5.9. ПРАВЫ ЧЛЕНАЎ НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА

- выбіраць і быць абраным у выбарны орган Незалежнага прафсаюза і праз яго рабіць уплыў на асноўныя напрамкі дзейнасці і склад прафсаюзных органаў;

- уносіць прапановы ва ўсе органы Незалежнага прафсаюза па пытаннях іх дзейнасці і прымаць удзел у іх абмеркаванні з правам дарадчага голасу;

- асабіста прымаць удзел у абмеркаванні пытанняў, звязаных з яго прафесійнай і грамадскай дзейнасцю;

- карыстацца ільготамі, дадзенымі Незалежным прафсаюзам сваім членам, дапамогай у час страйкаў і скарачэнняў, у выпадку смерці блізкіх сваякоў і ў іншых вызначаных Радай прадстаўнікоў выпадках;

- патрабаваць трацейскай камісіі;

- атрымліваць прававую абарону, юрыдычную, матэрыяльную і іншую дапамогу Незалежнага прафсаюза;

- свабодна выходзіць з Незалежнага прафсаюза па асабістай заяве.

## 5.10. АБАВЯЗКІ ЧЛЕНАЎ НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА

- ведаць і выконваць Статут;

- плаціць членскія ўзносы ў памеры, устаноўленым Статутам, і парадку, вызначаным Радай прадстаўнікоў;

- знаходзіцца на ўліку ў пярвічнай арганізацыі Незалежнага прафсаюза;

- рэгулярна наведваць сходы ( канферэнцыі) і прымаць удзел у іх рабоце;

- выконваць рашэнні з'ездаў, канферэнцый, сходаў, выбарных органаў Незалежнага прафсаюза;

- прапагандаваць мэты і задачы Незалежнага прафсаюза;

- не дапускаць дзеянняў, якія наносяць шкоду аўтарытэту Незалежнага прафсаюза;

- у час правядзення страйка ва ўстаноўленым парадку выконваць патрабаванні кіраўніцтва страйкам.

5.11. Для вырашэння спрэчных пытанняў паміж органамі Незалежнага прафсаюза і яго членамі можа быць створана трацейская камісія.

## 6. СРОДКІ І МАЁМАСЦЬ НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА

6.1. Сродкі Незалежнага прафсаюза складваюцца з членскіх узносаў, ахвяраванняў і дароў, паступленняў ад выдавецкай і рэкламнай дзейнасці, адлічэнняў ад даходаў створаных прадпрыемстваў, гаспадарча-разліковых структур і іншых не забароненых законам паступленняў.

6.2. Для выканання мэтаў і задач Незалежны прафсаюз можа мець ва ўласнасці будынкі або іх частку, збудаванні, жыллёвы фонд, абсталяванне, інвентар, маёмасць культурна-асветнага і фізкультурна-аздараўленчага прызначэння, грашовыя сродкі, якія маюць хаджэнне ў рэспубліцы, каштоўныя паперы, іншую маёмасць, прадпрыемствы, фірмы, банкі і іншыя гаспадарча-разліковыя фарміраванні.

6.3. Незалежны прафсаюз самастойна валодае, карыстаецца і распараджаецца грашовымі сродкамі і маёмасцю, якія належаць яму.

6.4. Уступны ўзнос раўняецца аднаму працэнту ад заробка за месяц, які папярэднічае ўступленню ў Незалежны прафсаюз.

6.5. Штомесячны членскі ўзнос члена прафсаюза складае не меней 1% штомесячнага заробку.

6.6. Навучэнцы, якія атрымліваюць даход ад вытворчай практыкі, працуючыя пенсіянеры плацяць узносы на агульных падставах.

6.7. Пенсіянеры, беспрацоўныя, навучэнцы і іншыя асобы, часова не працуючыя па ўважлівых прычынах, уносяць узносы ў памеры 0, 2% ад іх месячнага грашовага даходу ў парадку, вызначаемай Радай прадстаўнікоў Незалежнага прафсаюза.

6.8. Незалежны прафсаюз выкарыстоўвае свае сродкі на забеспячэнне дзейнасці, прадугледжанай гэтым Статутам, і выдаткоўвае іх у адпаведнасці з каштарысамі, зацверджанымі Радай прадстаўнікоў.

6.9. Незалежны прафсаюз мае права змяшчаць свае сродкі ва ўстановы банкаў, укладваць у вытворчую дзейнасць прадпрыемстваў, іншых гаспадарча - разліковых структур і выдаваць крэдыты па рашэнню Рады прадстаўнікоў.

6.10. Незалежны прафсаюз не адказвае па даўгах сваіх членаў, таксама як і яны не адказваюць па яго даўгах.

## 7. КАНТРОЛЬНА- РЭВІЗІЙНАЯ КАМІСІЯ НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА

7.1. Кантрольна-рэвізійная камісія (КРК) кантралюе дзейнасць любых выбарных органаў і структур Незалежнага прафсаюза ўсіх узроўняў у пытаннях выканання Статута, выдаткавання сродкаў, выкарастання маёмасці і іншай дзейнасці.

7.2. Старшыня, намеснік і члены КРК абіраюцца з'ездам Незалежнага прафсаюза.

7.3. Работай КРК кіруе старшыня ці яго намеснік.

7.4. Члены КРК не могуць быць абранымі ў іншыя выбарныя органы Незалежнага прафсаюза, займаць пасады кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў яго гаспадарча- разліковых структур.

7.5. Патрабаванні КРК, якія вынікаюць з яе кампетэнцыі, абавязковыя для ўсіх членаў выбарных органаў і структур Незалежнага прафсаюза.

7.6. КРК інфармуе Раду прадстаўнікоў Незалежнага прафсаюза аб выніках рэвізій і праверак і робіць справаздачу перад з'ездам.

## 8. СПРАВАВОДСТВА

8.1. Справаводства Незалежнага прафсаюза вядзецца ва ўстаноўленым парадку ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

8.2. Дакументы па гаспадарчай дзейнасці і асабістаму складу здаюцца ва ўстановы Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь па месцы знаходжання юрыдычнага адрасу.

# 9.ПАРАДАК СПЫНЕННЯ ДЗЕЙНАСЦІ НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА

9.1. Незалежны прафсаюз ліквідуецца па рашэнню з'езда ці суда.

9.2. Рашэнне з'езда аб ліквідацыі Незалежнага прафсаюза прымаецца не меней 3/4 галасоў абраных дэлегатаў з'езда.

9.3. У выпадку ліквідацыі Незалежнага прафсаюза маёмасць і грашовыя сродкі, якія засталіся пасля задавальнення ўсіх патрабаванняў крэдытораў, выкарыстоўваюцца па рашэнню ліквідацыйнай камісіі на статутныя мэты і задачы.

Прашыта і замацавана пячаткай
12 (дванаццаць) лістоў.

Кансультант упраўлення па пытаннях
некамерцыйных арганізацый
Міністэрства юстыцыі
Рэспублікі Беларусь

Я.А.Какуша